1990 года

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1990
ЧАЦВЕР
11
студзеня
№ 1 (1630)

КВЗ!

## ДЗЕ ПАЧАТАК ТАГО КАНЦА...

...якім канчаецца пачатак? Не разгубіцца ад такога пытання можна толькі на конкурсе вясёлых і знаходлівых. Пачуць адказ на яго — таксама толькі там.

Вы не даведаліся яшчэ шмат аб чым цікавым... нават калі глядзелі апошні КВЗ па Цэнтральнаму тэлебачанню, але не прыйшлі на сустрэчу беларускіх каманд, якая называлася «Навагодні баль у Сатаны» і праходзіла 23 снежня ў Доме палітасветы. Яна была не апошняй, і ў вас усё можа быць наперадзе. Калі вы пажадаеце:

— убачыць студэнтаў розных ВНУ разам;

— адчуць непадражальнасць студэнцкай фантазіі і непаўторнасць студэнцкага гумару;

— упэўніцца, што БДУ — лепшая навучальная ўстанова рэспублікі, бо яе каманда КВЗ проста па-за канкурэнцыяй;

— пакінуць у сваім сэрцы шмат яскравых уражанняў, якія будуць сярод галоўных успамінаў аб студэнцкім жыцці потым, калі яно застанецца ў далёкім мінулым...

Прыходзьце! Зноў і зноў!



НА ЗДЫМКУ: фрагмент з выступлення каманды БДУ — лепшай на тым вечары.

ШТО НОВАГА? ● ШТО НОВАГА? ● ШТО НОВАГА? ● ШТО НОВАГА? ● ШТО НОВАГА?

## На ўзроўні дэпутацкай этыкі

Столькі дэпутатаў адразу — 14! — мы бачылі толькі па тэлебачанню, у агульных планах апаратаў.

Народныя дэпутаты СССР ад Беларусі І. В. Абламейка, Ю. І. Варонежцаў, С. А. Габрусеў, А. А. Дабравольскі, М. І. Дзямчук, М. І. Ігнатовіч, Я. М. Кавалеўскі, В. М. Карніенка, Д. Ц. Лескін, Р. М. Падбярэзскі, Г. С. Тарнаўскі, У. Л. Фаменка, А. В. Чарнышоў, С. С. Шушкевіч — і ўсе адначасова, 6 студзеня, у актавай зале БДУ!

Яны, па іх жа словах, вырашылі часцей сустракацца з выбаршчыкамі, калі адчулі, што не ўсё атрымліваецца ў беларускай дэлегацыі на з'ездах. На сустрэчу ва універсітэце прыйшлі, каб абмеркаваць з выбаршчыкамі вынікі Другога з'езда і праблемы падрыхтоўкі да выбараў народных дэпутатаў БССР і мясцовых Саветаў.

А чаго чакалі ад сустрэчы тыя, хто запоўніў залу? Гэта больш складанае пытанне. Былі тут прадстаўнікі розных прадпрыемстваў і арганізацый горада, розных пакаленняў, жыццёвых прынцыпаў і палітычных поглядаў, нарэшце.

Былі цікавыя пытанні, глыбокія, прасякнутыя болем за агульнае. Былі правакацыйныя і зневажаючыя, жартаўлівыя і... наконт «працаўладкавання сына».

Пачалі, па прапанове рабочага завода імя Вавілава, з мінуты маўчання, якую прысвяцілі памяці акадэміка А. Д. Сахарава.

Усім дэпутатам прапанавалі абавязкова адказаць на два пытанні: як галасаваў на з'ездзе пры абмеркаванні пытання аб 6-ым артыкуле Канстытуцыі і аб выбарах дэпутатаў ад грамадскіх арганізацый.



Цікавыя лічбы. З 94 беларускіх дэпутатаў за абмеркаванне 6-га артыкула прагаласавала 40, супраць — 42, шасцёра ўстрымаліся, а яшчэ шасцёра на тым пасяджэнні адсутнічалі.

Пытаннем аб міжрэгіянальнай дэпутацкай групе цікавяцца ўсе. Дэпутат С. А. Габрусеў паведаміў, што ў пачатку яе арганізацыі, калі ўсё адбывалася толькі на ўзроўні размоў, група аб'ядноўвала каля 480 чалавек. А вось калі патрабавалася падпісацца пад зваротам, які, па сутнасці, абвясціў міжрэгіянальную групу апазіцыяй большасці на З'ездзе, гэта зрабілі толькі 160 дэпутатаў.

Нейкія пытанні і рэплікі з залы дэпутаты ўспрымалі аднолькава — напаміналі аб існаванні дэпутацкай этыкі. Былі падставы, відаць, для таго, каб прагучала просьба С. С. Шушкевіча, які вёў сустрэчу: «Таварышы! Мы сустракаемся ва універсітэце, давайце ж прытрымлівацца ўзроўню гэтай установы!»

Але «забароненага», смелага і прыгожага ў сваёй разумнасці ўсё роўна было шмат. Дакладней, не ўсё роўна, а менавіта таму і было, што слова «культура» паўтарылі неаднаразова.



Якім нерэальным гэта ні здавалася б, але за час сустрэчы кожны дэпутат зпрысутных пабываў на трыбуне, некаторыя па некалькі разоў. Па сваёй ініцыятыве прыйшла да выбаршчыкаў Л. М. Сыраегіна, сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Пералічэнню вынікі такой сустрэчы не паддаюцца. Яны разбегліся з залы, калі людзі яе пакінулі, каб захавацца ў іх сэрцах і розуме. Словамі гэта не сфармулюеш, значыць, яно павінна стаць залогам рэальнага, значнага руху ў будучым.

Адзін вынік усё ж можна перакласці на паперу. Сход завяршыўся прыняццем рэзалюцыі. Яна патрабуе: афіцыйнай рэгістрацыі Беларускага народнага фронту як рэальна існуючай палітычнай арганізацыі; апублікавання ў рэспубліканскім друку перадвыбарнай праграмы БНФ, а таксама — вынікаў пайменнага галасавання народных дэпутатаў з Беларусі па пытаннях абмеркавання 6-га артыкула Канстытуцыі СССР і выбараў ад грамадскіх арганізацый, якое адбылося на Другім з'ездзе народных дэпутатаў.

ПАРОЛЬ — СЕСІЯ

## Гульня ў адны вароты

Сесія пачалася, і да падручніка даводзіцца звяртацца нават тым, хто дагэтуль забываўся на яго увесь семестр. І амаль што ў кожным дапаможніку па грамадска-палітычных навуках ёсць глава або раздзел, назва якіх пачынаецца адным і тым жа рэзкім словам — крытыка. Крытыкуецца заходняе, напрыклад, навуковыя тэорыі, «адтуль». Фантазія, з якой выдумваюцца груваcткія фармулёўкі, проста невычэрпная. Але няма за гэтымі словамі галоўнага — дакладнага пераказу зместу тых пазіцый, якія крытыкуюцца. Часта яны трапляюць у нялітасць да нашых прафесараў толькі таму, што не супадаюць з іх пунктам гледжання.

Але ж які ўжо год за вокладкамі нашых падручнікаў?..

Калі студэнт захоча пазнаёміцца з працамі якіх-небудзь з тых «буржуазных рэвізіяністаў», пра якіх ён чуў дагэтуль толькі негатыўнае, зрабіць гэта ён не зможа,— на рускай мове большасць з іх яшчэ не выдадзена. Ёсць замежныя часопісы, але некаторыя артыкулы з іх часам проста вымаюцца. У такіх умовах лёгка весці дыскусію з апанентамі. Можна вырываць любое выказванне з кантэксту, тэндэнцыйна падбіраць цытаты — другі бок усё роўна маўчыць. Такім чынам, нашы грамадазнаўцы гуляюць у адны вароты.

Пакуль гэта гульня будзе працягвацца, пакуль кожны не будзе мець магчымасць прачытаць працы хаця б даўно і традыцыйна варожых нам вучоных (Ніцшэ, Шапенгауэр), сярод нас будуць нараджацца новыя ілжэпрафесары. Тады мы так і не атрымаем сапраўды цвярозага погляду на сябе, на навакольны свет.

У Леніна ёсць думка аб тым, што ніхто не пакрытыкуе лепш, чым разумны вораг. Не пазбаўляючы сябе такой крытыкі, мы пачнём ствараць гарантыі лепшай будучыні.

А. АРШАНСКІ,
студэнт факультэта журналістыкі.

СПЫНІЦЕСЯ, КАЛІ ЛАСКА!

## У залікоўцы... экслібрыс

Да заліку яны рыхтаваліся... на мастацкай выстаўцы. Не студэнты тэатральна-мастацкага інстытута, а матэматыкі з БДУ,— якія апошні раз праглядалі канспекты і падручнікі ў холе трэцяга паверха, дзе вісяць экспанаты. Цікава, як уздзейнічала такое асяроддзе на паспяховасць іх адказаў?

Зрэшты, саму выстаўку гэтыя студэнты пакідалі па-за ўвагай — не да яе зараз, калі сесія пачалася. Ды й наогул, большасць тых, хто з'яўляецца на трэцім паверсе галоўнага корпуса ў сярэдзіне працоўнага ці вучэбнага дня, абыходзяць хол бокам. Мала цікавяцца нават самой асобай мастака — аўтара ўсіх работ Яўгена Ціхановіча: да рамкі з яго партрэтам і творчай біяграфіяй падыходзяць не часцей, чым да астатніх рамак, вывешаных тут.

А мастацтва пад цудоўнай лацінскай назвай «экслібрыс» тым часам так і застаецца загадкай для ўсіх, хто праходзіць міма...

Рукой і сэрцам мастака Ціхановіча створана каля 400 экслібрысаў — кніжных знакаў, значыць. Частка з іх паездзіла па розных краінах свету. І ўглядаліся тыя людзі ў гэтыя родныя для нас твары — Купалы, Багдановіча, Каліноўскага... Можа, і вы паспрабуеце? Бо апошні раз, магчыма, рабілі гэта, калі сумавалі над старонкай школьнага падручніка.

Калі не ўбачыце ў гэтых позірках водбліску таямніцы, якая нечакана пачынае адчыняцца для вас; калі не знойдзеце ў гэтым чароўным слове «экслібрыс», акрамя яго традыцыйнага значэння (у перакладзе з лацінскай мовы — з кніг), яшчэ нешта непаўторна-асабістае... Тады проста прачытайце літары, яны таксама тут ёсць.

«...Гэта самая багатая і самая чыстая гаворка...»—А. Міцкевіч пра беларускую мову.

«Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!» — гэта заклік Ф. Багушэвіча.

Вы паслухаеце яго і — пойдзеце на залік. Ці нават на экзамен да прафесара, якога крыху баяліся, — так паважалі за энцыклапедычнасць ведаў. Пэўна, вы ўбачыце гэтага чалавека і ўпершыню адчуеце не страх, а ўпэўненасць, што раптам наблізіліся на адну прыступку да яго прафесарскіх вяршынь. Хоць зусім не на «выдатна» падрыхтаваліся да экзамену па яго прадмету...

Дзяжурная служба «Беларускага універсітэта»:
Вераніка БЯГУН,
Сяргей ГРЫЦ (фота).

НЯЎЖО?!

## НАРЭШЦЕ — ДОБРААХВОТНАЯ

Халодны і цёмны зімовы вечар. «Грозныя» абаронцы парадку гуляюць у «даганялкі», выробляюць нагамі самыя фантастычныя танцавальныя «па». Гэта студэнты-дружыннікі. Потым, не вытрымаўшы, яны схаваліся ў вестыбюлі інтэрната, што знаходзіўся паблізу. Абагрэўшыся і з'еўшы ўсе цукеркі з кішэняў, дружыннікі так больш і не выйшлі на вуліцу, пакуль не прыйшоў час ехаць у райаддзел міліцыі — адзначацца, што дзяжурства ДНД адбылося... Тых, хто не з'явіўся, выдумаўшы самыя нечаканыя прычыны, таксама занеслі ў спіс — хто гэта праверыць?

Сённяшнія старшакурснікі яшчэ добра памятаюць падобныя сітуацыі, як і тыя, калі збягалі ад факультэцкага адказнага за дзяжурствы дружыны. На нейкі час гэтыя адказныя быццам бы зніклі. Каб прыйсці ў новай якасці.

На фізфаку ўсё змянілася са з'яўленнем адной аб'явы. Тут фарміруецца атрад добраахвотнай народнай дружыны колькасцю 10—12 чалавек. Плануецца мець пастаянны састаў, і адказнасць будзе, за сябе і за іншых. А галоўнае — стымул з'явіўся. Члены факультэцкага камітэта камсамола, як сцвярджае іх сакратар Генадзь Грынчык, лічаць стымул — матэрыяльны — найбольш дзейсным. Таму і вырашылі за кожнае дзяжурства плаціць членам атрада па 5—7 рублёў з прэміяльнага фонду камітэта камсамола.

Пакуль пададзена 4 заявы. Можа, студэнты сесіяй заняты і не звяртаюць увагі на аб'явы? А можа, чакаюць, калі з'явіцца абяцанне плаціць за дзяжурствы членам не толькі універсітэцкай ДНД, але і тым, хто будзе садзейнічаць парадку ўнутры фізічнага факультэта? Такія намеры ў камітэта камсамола таксама ёсць...

ШТО НОВАГА? ● ШТО НОВАГА? ● ШТО НОВАГА? ● ШТО НОВАГА?

# РЭЗАЛЮЦЫЯ,

## прынятая ўдзельнікамі дыскусіі «Партыя і перабудова», камуністамі і беспартыйнымі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна 20 снежня 1989 г.

Камуністы і беспартыйныя Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна — удзельнікі дыскусіі «Партыя і перабудова» заклапочаны тым, што партыя не ў поўнай меры садзейнічае забеспячэнню працэсу перабудовы. Больш таго, перабудова ў самой партыі адстае ад узроўню перабудовачных працэсаў у астатняй частцы грамадства.

Перабудова дзейнасці партыі ва ўсіх яе звеннях, асабліва ў выбарных органах, стрымліваецца адсутнасцю цэласнай навукова абгрунтаванай стратэгічнай і тактычнай праграмы. Партыйны апарат працягвае функцыяніраваць як адзін з механізмаў агульнай каманднa-адміністрацыйнай сістэмы.

У сучасных умовах не толькі шкодна, але і небяспечна ў палітычных адносінах толькі дэклараваць ролю партыі як кіруючай і накіроўваючай сілы грамадства, або бачыць заслугі партыі ў тым, што яна аб'явіла палітыку перабудовы, дэмакратызацыі, галоснасці. Надышоў час практычных дзеянняў. Ад партыі патрабуецца, калі яна прэтэндуе на ролю авангарднай грамадскай сілы, распрацоўка стратэгічнай праграмы перабудовы ўсіх бакоў грамадскай жыццядзейнасці, выкананне на справе ролі палітычнага лідэра. Для ажыццяўлення гэтых мэт неабходны распрацоўка і прыняцце новых Статута і Праграмы КПСС.

У мэтах далейшага развіцця ўнутрыпартыйнай дэмакратыі ўдзельнікі дыскусіі прапануюць:

1. Перагледзець канстытуцыйны статус партыі — не ўключаць у тэкст новай Канстытуцыі палажэнне аб кіруючай і накіроўваючай ролі партыі.

2. Узаемаадносіны партыі з іншымі грамадскімі арганізацыямі павінны будавацца на аснове раўнапраўя, супрацоўніцтва і палітычнага дыялогу.

3. Асноўнай задачай усіх звенняў партыі павінна стаць палітычнае забеспячэнне стратэгічных і практычных праграм перабудовы савецкага грамадства.

4. Увесці ў практыку правядзенне агульнапартыйных дыскусій і рэферэндумаў па пытаннях партыйнага жыцця.

5. Прадугледзець у новых Статуце і Праграме КПСС:

— перагляд прынцыпа дэмакратычнага цэнтралізму з мэтай забеспячэння гарантыі правоў і рэальных магчымасцей для меншасці адстойваць сваю думку, а таксама замацавання прынцыпу падпарадкаванасці не вышэйстаячым, а вышэйшым органам партыі — з'езду, канферэнцыі, сходу;

— прамыя выбары сакратароў усіх узроўняў на альтэрнатыўнай аснове з папярэднім абмеркаваннем платформы кандыдатаў. Адмовіцца ад практыкі зацвярджэння сакратароў вышэйстаячымі партыйнымі органамі;

— падбор і расстаноўку ўсіх партыйных кадраў толькі на конкурснай аснове па рэкамендацыях пярвічных арганізацый, дзе яны павінны заставацца на партыйным уліку;

— магчымасць адстаўкі партыйнага кіраўніка;

— выбары дэлегатаў партыйных з'ездаў і канферэнцый па тэрытарыяльнаму прынцыпу прамым тайным галасаваннем;

— прадастаўленне права свабоднага выхаду з партыі па ўласнаму жаданню без разгляду персанальнай справы, з гарантыяй сацыяльнай абароненасці;

— прадастаўленне права пярвічным партыйным арганізацыям прыняцця канчатковага рашэння аб прыёме кандыдатамі ў члены КПСС і аб разгледжанні персанальных спраў членаў арганізацыі пры тайным галасаванні. Вышэйстаячыя партыйныя органы разглядаюць іх толькі ў выпадку апеляцыі;

— уключэнне ў Статут КПСС раздзела «Уласнасць і грашовыя сродкі партыі»;

— новы парадак уплаты членскіх узносаў. Іх налічэнне праводзіць, зыходзячы з заработнай платы, атрыманай пасля ўтрымання падатку. Прадаставіць пярвічным партарганізацыям права расходаваць грашовыя сродкі памерам 40 працэнтаў ад паступаючых партыйных узносаў. Вызваліць ад уплаты членскіх узносаў тых пенсіянераў, якія не працуюць;

— штогадовыя справаздачы кіруючых партыйных органаў аб выкарыстанні партыйных сродкаў з наступным апублікаваннем у друку;

— змену структуры партыйных органаў за кошт ліквідацыі РК у буйных гарадах з раённым дзяленнем, аб'яднаннем АК і ГК у гарадах абласнога падпарадкавання, а таксама прадастаўлення права пярвічным партыйным арганізацыям самім вызначаць сваю ўнутраную структуру;

— правядзенне сходаў у пярвічных арганізацыях па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу ў квартал.

6. Прызнаць несумяшчальным з членствам у партыі надзяленне кіруючым саставам партыі саміх сябе рознымі прывілеямі.

7. Забяспечыць магчымасць доступу членаў КПСС да партыйнай інфармацыі. Ліквідаваць само паняцце «партыйная тайна» для членаў партыі. Рэгулярна і своечасова публікаваць у партыйным друку стэнаграфічныя справаздачы з Пленумаў ЦК КПСС і ЦК КПБ.

8. Прапанаваць ЦК КПСС змяніць паслядоўнасць правядзення справаздач і выбараў у партыі, маецца на ўвазе спачатку правесці XXVIII з'езд КПСС, на якім прыняць Статут і Праграму КПСС, абнавіць кіраўніцтва партыі. Потым, вызначыўшы месца кожнага камуніста ў адпаведнасці з прынятымі новымі праграмнымі дакументамі, правесці справаздачы і выбары ў астатніх структурных звеннях партыі, пачынаючы з пярвічных партарганізацый.

## СВЕДЧАЦЬ САЦЫЁЛАГІ

ЦІ МОЖНА сказаць сёння, што аўтарытэт партыі ў грамадстве, як правіла, высокі? Гэтую думку пацвярджаюць 6,2 працэнта з 300 апытаных студэнтаў і 6,7 працэнта ўдзельнікаў дыскусіі «Партыя і перабудова». Адмаўляюць — адпаведна 86,4 і 93,3 працэнта. Не пажадалі адказваць 7,4 працэнта студэнтаў.

АПОШНІМ ЧАСАМ усё часцей узнімаецца пытанне аб неабходнасці зняцця 6 артыкула Канстытуцыі СССР аб кіруючай ролі партыі ў грамадстве. Што аб гэтым думаюць студэнты і ўдзельнікі дыскусіі?

Ліквідаваць неадкладна — адпаведна 40,5 і 51,9 працэнта.

Зняць у працэсе стварэння новай Канстытуцыі — 34,7 і 33,6 працэнта.

Перапрацаваць — 18,9 і 9,2 працэнта.

Пакінуць без змяненняў — 2,3 і 4,6 працэнта.

АДКАЗВАЮЧЫ НА ПЫТАННЕ: у якіх узаемаадносінах павінны быць КПСС і камуністычныя партыі саюзных рэспублік, 60,7 працэнта ўдзельнікаў дыскусіі і 71,4 працэнта студэнтаў лічаць, што яны павінны ўваходзіць у склад КПСС, але мець свой Статут і Праграму.

ЗА НЕАБХОДНАСЦЬ ШМАТПАРТЫЙНАЙ сістэмы на сучасным этапе перабудовы выказалася каля 70 працэнтаў студэнтаў і каля 59 працэнтаў удзельнікаў дыскусіі.

ЦІ МОЖА ЧЛЕН КПСС з'яўляцца членам нефармальнага аб'яднання? «Чаму б не?» — здзівіліся 74 працэнты ўдзельнікаў дыскусіі і 87,6 працэнта студэнтаў. Затое адпаведна 18,3 і 7 працэнтаў ставяцца да такой прапановы адмоўна.

ЧАСАМ ГУЧАЦЬ галасы аб неабходнасці здзяйснення жорсткага курсу «закручвання гаек». Станоўча ставяцца да гэтага 16 працэнтаў удзельнікаў дыскусіі і 8,7 працэнта студэнтаў, адмоўна адпаведна 73,1 і 77,8 працэнта.

## СВОЙ РАДОК У СПРЭЧКАХ

# А ЯШЧЭ ЁСЦЬ МЕРКАВАННІ...

### ЯНЫ ВЫКАЗАНЫ АСОБНЫМІ КАМУНІСТАМІ

*Членства ў партыі не звязваць з абавязковым удзелам у рабоце пярвічнай партарганізацыі.*

Надзяліць пярвічныя партарганізацыі правам грашовай даплаты сакратарам, намеснікам, членам бюро.

*З фонду партыйных узносаў, якія пакідаюцца ў пярвічнай арганізацыі, аказваць матэрыяльную дапамогу камуністам, утварыць фонд заахвочвання.*

Скасаваць кандыдацкі стаж.

*Аклады вызваленым партыйным работнікам вызначаць на адпаведных з'ездах, канферэнцыях, сходах.*

Дазволіць існаванне ўнутрыпартыйных фракцый.

*Ліквідаваць выпадкі кааптацыі ў складзе парторганаў камуністаў, якія не працуюць у дадзенай партыйнай арганізацыі.*

Памяняць арганізацыйную структуру ЦК КПСС (ЦК КПБ), пакінуўшы два аддзелы: арганізацыйна-партыйнай работы і ідэалагічны.

*Рашэнні вышэйстаячых партыйных арганізацый маюць сілу пасля адабрэння іх 2/3 пярвічных арганізацый.*

# ДЭКЛАРАЦЫЯ БЕЗ ПРАВОЎ

**Мы нарэшце атрымалі запознены падарунак. Ён ішоў да нас больш за 40 гадоў...**

**Яшчэ ў 1948 годзе Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый была прынята Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека. У канцы 1989-га газета «Аргументы и факты» надрукавала яе для нас. Дзесяцігоддзі не пазбавілі гэты дакумент актуальнасці і прыгажосці.**

**Пагаворым аб гэтым з кампетэнтным субяседнікам. Лілія Уладзіміраўна УЛАСАВА, дацэнт юрыдычнага факультэта, займаецца міжнародным правам. У гэтай галіне напісана яе кандыдацкая дысертацыя, той жа тэме быў прысвечаны цыкл работ, за які яна ў 1986 годзе атрымала прэмію Ленінскага камсамола Беларусі.**

**— Упершыню прачытаўшы артыкулы Дэкларацыі зараз, людзі ў большасці сваёй, безумоўна, расчараваны. Бо ёсць сярод пералічаных там такія правы, аб якіх нам пакуль можна толькі марыць.**

**Можа, тлумачэнне гэтаму сумнаму факту ў нейкай ступені дае гісторыя з'яўлення Дэкларацыі?**

— Вялікім штуршком была Другая сусветная вайна, якая толькі-толькі скончылася. Міжнароднае таварыства палічыла сваім абавязкам заявіць тады аб тым, як яно разумее правы чалавека, які ўзровень асэнсаванасці гэтай праблемы існуе.

Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека была распрацавана Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і падтрымана многімі краінамі, у тым ліку і нашай. Дэкларацыя не абавязковая для выканання дзяржавамі — яна мае рэкамендацыйны характар.

СССР, УССР і БССР як члены ААН прагаласавалі за гэты дакумент. Але і сёння мы яшчэ не можам ажыццявіць значную частку правоў, якія ён абвясціў. Справа ў тым, што механізм гарантый гэтых правоў можа дзейнічаць толькі ў ГРАМАДЗЯНСКІМ ГРАМАДСТВЕ. Гэта значыць там, дзе не толькі індывідуум мае абавязацельствы перад дзяржавай, але не ў меншай ступені — дзяржава мае абавязацельствы перад кожнай асобай. Відавочна, што наша грамадства пакуль не дасягнула такога стану.

**— Тады атрымліваецца, што мы з вамі не можам сёння нават зрабіць параўнанне правоў чалавека, якія маюць грамадзяне СССР, і правоў, абвешчаных Дэкларацыяй, і наша гаворка ў такім разе проста не мае практычнага сэнсу?**

— На жаль, гэта так.

Прававая дзяржава ў нас пакуль існуе толькі на ўзроўні дыскусій, па сутнасці, гэта яшчэ толькі ідэя. Навука павінна яе абмяркоўваць. Але не забываць пры гэтым пра гістарычны вопыт іншых краін, якія прыйшлі да прававога грамадства толькі шляхам грамадзянскасці і дэмакратызацыі свайго грамадства. А мы хочам адначасова дэмакратызаваць наша грамадства і будаваць прававую дзяржаву. Нават такая радыкальная мера, як стварэнне Камісіі канстытуцыйнага нагляду,— яшчэ не выратаванне.

У нашай гісторыі былі ўжо сумныя прыклады. Канстытуцыя 1936 года. Яна лічылася адной з самых дэмакратычных у свеце, даючы на словах мноства свабод сваім грамадзянам. І якая жахлівая беззаконнасць ажыццяўлялася пад яе прыкрыццём!

**— Магчыма, акрамя Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, існуюць іншыя дакументы на ўзроўні ААН, прызнаныя нашай краінай?**

— Ёсць такія. Але пра іх трэба гаварыць са значнымі агаворкамі.

Хутка пасля прыняцця Дэкларацыі дзяржавы-члены ААН вырашылі распрацаваць не рэкамендацыйныя, а абавязковыя для выканання дакументы ў той жа галіне — правоў чалавека. Гэта былі Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах і Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, прынятыя ў 1966 годзе.

У 1973 годзе наша дзяржава ратыфіцыравала абодва Пакты, гэта значыць абвясціла ўсяму свету, што мы абавязуемся выконваць палажэнні, пералічаныя ў іх, на ўзроўні міждзяржаўных адносін. Але ў сістэму нашага ўнутранага права Пакты не ўвайшлі: для гэтага трэба было прыняць спецыяльныя акты, напрыклад, Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета. Толькі ў такім выпадку суды мелі б магчымасць выкарыстоўваць палажэнні Пактаў як закон.

**— А як гэта выглядае ў іншых краінах?**

— У Злучаных Штатах, напрыклад, любы міжнародны акт становіцца нормай унутранага права, як толькі Кангрэс прымае рашэнне аб яго ратыфікацыі.

**— Чаму ж няма такога механізму ў нас?**

— Да апошняга чаму мы не мелі аб'ектыўных ўмоў для таго, каб нормы міжнароднага права ператвараліся ў нацыянальныя: мы толькі дэкларатыўна заяўлялі аб сваёй прыналежнасці да гэтых норм, на самой справе амаль што не выконваючы іх.

Інфармацыю аб пагадненнях на ўзроўні ААН у нас маюць толькі спецыялісты. Хто, акрамя юрыстаў, ведае, напрыклад, што гэтай арганізацыяй прынята ўжо каля 30 дакументаў, прысвечаных самым розным галінам правоў чалавека? У іх абараняюцца правы жанчын і дзяцей, бежанцаў і каланіяльных краін...

Мы толькі пачалі прызнаваць свае памылкі ў ацэнцы дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, надрукаваўшы выступленні на яе Генеральнай Асамблеі М. С. Гарбачова (у 1987 годзе) і Э. А. Шэварднадзе. Але гэты працэс доўгі і паступовы—ад перагляду пазіцый да канкрэтных дзеянняў.

Зараз нам трэба вучыцца ў міжнароднага права, значна вышэйшага па юрыдычнаму і тэхнічнаму ўзроўню за наша ўнутранае.

**— Ці згодны Вы з тымі юрыстамі, якія лічаць, што добрую дапамогу для нас можа аказаць стварэнне ва ўсіх ВНУ, не толькі юрыдычных, кафедраў абароны правоў чалавека?**

— Так, гэта проста неабходна. Бо ў нас нават студэнты-юрысты не заўсёды ведаюць свае правы, не гаворачы ўжо пра ўсіх астатніх.

На нашым факультэце вельмі мала гадзін аддаецца праблемам правоў, патрэбны новыя курсы і спецкурсы па гэтай тэматыцы. Студэнты і выкладчыкі Маскоўскага універсітэта ў гэтым сэнсе выйграюць: у іх ёсць кафедра міжнароднага публічнага права, кафедра знешнеэканамічных сувязей, каля 6 спецкурсаў па правах чалавека.

**— Вяртаючыся да Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Яна надрукавана, і цяпер кожны мае магчымасць супастаўляць з яе палажэннямі ступень сваёй свабоды. У нас няма пакуль гарантый выканання правоў, абвешчаных Дэкларацыяй, на дзяржаўным узроўні. Але, магчыма, кожны чалавек можа знайсці механізм гэтых гарантый у сабе?**

— Безумоўна. Пастаяннай барацьбой за сябе як за асобу, барацьбой за свабоду.

Гутарыла **В. БЯГУН.**

*Студэнт і практыка, студэнт і інтэрнат, студэнт і завочнае навучанне... Нягледзячы на тое, што перабудова вышэйшай адукацыі, здаецца, пачалася, тым не менш студэнтам застаецца толькі чакаць змен да лепшага. А яшчэ... зайздросціць навучэнцам ВНУ іншых краін, напрыклад, Балгарыі.*

# МАРЫ ЗБЫВАЮЦЦА

## ЦІ ТАК У ВАС?

Які студэнт, што жыве ў інтэрнаце, не марыць аб утульным пакоі на два чалавекі? А чаму б яму не займець кватэру: спальня, кабінет, гасціная? Тут жа ванна. Або зала і кухня з халадзільнікам і газавай плітой?

Далей можна ўявіць ветлівую бабульку ля ўваходу ў інтэрнат, якая аднолькава гасцінна сустракае і студэнтаў, і іх сяброў. Яна вам усміхаецца і вы яе таксама адорваеце ўсмешкай. А на душы спакойна і радасна. Па асфальтавай паласе снуе аўтобус, які давязе да ВНУ за пэўны (загадзя распісаны) час. Яшчэ лепей вучэбныя корпусы размясціць тут жа.

Пасля заняткаў, зразумела, абед, недарагі і апетытны. І атрымліваецца цэлы гарадок, дзе ўсё добраўпарадкавана, прадугледжана і забяспечана. А жыхары гэтага гарадка, яго гаспадары — студэнты. Магчымы варыянты. Палёт фантазіі нічым не абмяжоўваецца.

Я пабачыла такі на ўласныя вочы. Мінулым летам групу студэнтаў хімічнага факультэта прымалі балгарскія студэнты Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага. Мары пачалі збывацца яшчэ на вакзале, калі мы селі ў аўтобус «Універсітэт — студэнцкі гарадок «Хрыста Боцеў». Не ўсё ў рэальным горадзе адпавядала мары, але многае для яе набліжэння было зроблена. Перш за ўсё сам факт існавання такога гарадка — усё ў жыцці цячэ і змяняецца, а ён застаецца маладым.

Тут створаны практычна ўсе (тэарэтычна яшчэ можна прыдумаць) умовы для нармальнага жыцця студэнта. Магазіны — прадуктовыя і прамтаварныя, гароднінныя кіёскі, дзіцячыя пляцоўкі (!) і побач дзіцячае кафэ. У гарадку свой універсам, які забяспечвае прадуктамі не горш, а бывае і лепш за звычайныя універсамы ў горадзе. Харчуюцца студэнты ў сталовай па талонах коштам 50 капеек. Прычым, прапануецца выбар з трох найменняў першых і другіх страў.

Кожны інстытут мае свой відэасалон, дыскатэку і бар, якія размяшчаюцца ў інтэрнатах, у памяшканнях, прадугледжаных загадзя, а не абсталяваных пры неабходнасці. Ёсць стадыёны, тэнісныя корты. Многія ВНУ маюць басейны. Пабудаваны некалькі канцэртных залаў, напрыклад, адзін з іх называецца «Універсіяда» (дарэчы, там мы трапілі на канцэрт рок-групы «Машына часу»). Праўда, спартыўныя збудаванні і канцэртныя залы знаходзяцца крыху далей ад самога гарадка, але ўсё такі яны належаць студэнтам.

Уваход у інтэрнаты дазволены да гадзіны ночы. І... крыху нязвыкла паводзяць сябе вахцёры ў інтэрнатах. У першы вечар у Сафіі мы пазнаёміліся са сваімі калегамі з Адэсы і, зразумела, з балгарскімі студэнтамі. Спачатку спявалі песні пад гітару на трох мовах: рускай, украінскай і балгарскай, потым гулялі па начной Сафіі. Здарылася так, што ў інтэрнат вярнуліся каля трох гадзін ночы. Нехаця накіраваліся да ўваходных дзвярэй, падрыхтаваўшыся выслухаць «кампліменты» наконт нашага позняга вяртання. Якім жа было наша здзіўленне, калі на ціхі стук дзверы адчыніліся. І перш, чым мы падрыхтаваліся да апраўданняў, вахцёр, прапусціўшы нас, пажадаў «спакойнай ночы».

Няма тут звыклых для нашых інтэрнатаў дзяжурных студэнтаў, уся місія якіх зводзіцца да таго, каб фіксаваць, хто да каго і на колькі прыходзіць. Дастаткова пакінуць вахцёру дакумент і можна спакойна ісці туды, куды прыйшоў, а не чакаць прахожага студэнта з патрэбнага паверха.

Напэўна, у балгарскіх студэнтаў ёсць свае праблемы, якія мы як госці не заўважылі. Я толькі паспрабавала перадаць свае ўражанні і назіранні.

Т. ЗАГНІЙ,
выпускніца.

МАНАЛОГ ЗАЦІКАЎЛЕНАГА ЧАЛАВЕКА

# РАСКЛАД НЕ Ў ЛАД

У многіх слова «завочнік» выклікае іранічную ўсмешку і часцей за ўсё асацыіруецца з непрыемнымі эпітэтамі: гультай, невук... Тэма абранага даследавання будзе такая: завочнае навучанне вачыма завочніка.

Для чаго вучыцца чалавек ва універсітэце? Для атрымання ведаў, будучай навуковай ці выкладчыцкай дзейнасці, работы на вытворчасці... Але, здаецца, гэта толькі на паперы. Скажам, веды. Усе гавораць аб сумных, нудных лекцыях у паўпустых аўдыторыях, дрэнных падручніках, недахопе неабходнай (не гаворачы ўжо пра рэкамендуемую да вывучэння) літаратуры, часта некампетэнтных у сваім прадмеце выкладчыках. Я не хачу прычэпліваць ярлыкі некампетэнтнасці: усе мы ведаем выдатных вучоных і педагогаў, якія працуюць у нашай ВНУ, але, на жаль, іх не большасць. Нават на дзённым аддзяленні. А можаце ўявіць сабе — на завочным?

Як мы вучымся? Ад сесіі да сесіі. Калі наогул гэта можна назваць вучобай. Сесія з 7 да 22 ліпеня. За гэты час удзельнічаем у вялікай колькасці семінараў, здаём курсавую (датэрмінова). А экзамены? Гісторыя КПСС (!) — І частка, гісторыя СССР са старажытнейшых часоў, гісторыя старажытнай Грэцыі і Рыма, археалогія (можна было здаць датэрмінова). Прадметы аб'ёмныя, ды плюс два залікі: па замежнай мове і гісторыі БССР са старажытных часоў да XVIII стагоддзя.

А расклад у нас проста цудоўны. Мяркуйце самі: на тыдні два экзамены, адзін у панядзелак, другі ў пятніцу. Экзамен звычайна пачынаецца ў 16.00. Увесь тыдзень праводзяцца заняткі і семінары з 8.00 да 15.35. Да семінараў, як вядома, трэба рыхтавацца, а лекцыі выкладчыка, які праз пару дзён будзе прымаць у цябе экзамен, запісваць. Або хаця б наведаць аўдыторыю, каб запомніў ён твой твар. Акрамя таго, праводзяцца заняткі па прадметах, якія мы будзем здаваць на наступнай сесіі.

Увогуле, да 16.00 Аляксандр Неўскі ўяўляецца Аляксандрам Македонскім, Іван Грозны — сваім сынам, прычыны — вынікамі, базісы — надбудовамі. Галава, здаецца, набіта ведамі, але на канкрэтнае пытанне цяжка раскапаць у гэтых патайніках адпаведны адказ. Што ж казаць пра высокія адзнакі, культуру адказа, яго лагічнай пабудове, калі кожны згодзен на троечку (стыпендыю ўсё роўна не атрымліваем пры любых адзнаках).

Між тым дыпломы ў стацыянарнікаў і завочнікаў аднолькавыя. І каму справа, што гэта будучыя педагогі, якім мы даверым нашых дзяцей, інжынеры, якім адраджаць эканоміку краіны. Сустракаюцца апантаныя людзі: бегаюць па бібліятэках, гартаюць старыя падшыўкі, начамі сядзяць над падручнікамі. Перад імі тысячы перашкод, недахоп часу.

А вазьмём звычайнага завочніка, у якога ў наяўнасці тэрмін здачы экзаменаў, работа (8 гадзін у суткі), сям'я (можа, і дзеці), падручнік застойнага часу выдання, дзе кожнае сцвярджэнне — догма. Ён не мае вольнага часу, магчымасці часта наведваць бібліятэкі (жыве ў маленькім горадзе або вёсцы), карыстацца дэфіцытнымі кнігамі, апошняй публіцыстыкай, даведнікамі. І ператвараецца экзамен у бегатню, надакучванне выкладчыку, зневажаючае выпрошванне троечкі.

Чаму ж пры ўсіх гэтых недахопах студэнт задавальваецца завочным аддзяленнем? Прычын можа быць вельмі многа, але, мабыць, самая галоўная — гэта нізкая стыпендыя студэнтаў дзённага аддзялення. Многія з тых, хто хоча атрымаць вышэйшую адукацыю, ужо не могуць жыць, па тых ці іншых прычынах, на ўтрыманні бацькоў 5 гадоў. Таму вымушаны яны працаваць, выхоўваць дзяцей і вучыцца адначасова. Значыць, без завочнага ўсё ж не абысціся. Але не без такога, якім яно з'яўляецца зараз.

Я не звяртала б вашу ўвагу на праблемы завочнага навучання, калі б не мела канкрэтных прапаноў.

Многія мае аднакурснікі падзякавалі б за перанос экзаменаў і кансультацый па прадметах, што здаюцца, на першую частку сесіі. Лекцый па дысцыплінах наступнага семестра, семінараў, практычных заняткаў — на другую палову. Гэта, безумоўна, не канчатковы варыянт. Есць і іншыя: зрабіць дзве маленькія сесіі, напрыклад.

Не адмовіліся б завочнікі і ад выпуску спецыяльных бюлетэняў для іх, дзе былі б усе апошнія навіны навукі: даследаванні, гіпотэзы, перспектывы. Пажадана, каб з каментарыямі выкладчыкаў універсітэта.

А ўвогуле можна дагаварыцца да дыскусіі паміж выкладчыкамі і студэнтамі-завочнікамі па праблеме перабудовы завочнага навучання ў БДУ. Да гэтага часу кіраўніцтва завочнага дэканата павінна распрацаваць свае прапановы па паляпшэнню вучэбнага працэсу, каб размова са студэнтамі не ператварылася ў пустую гаварыльню.

І апошняе. У нас ва універсітэце ёсць добры вопыт арганізацыі дзён завочніка, які можна выкарыстоўваць у распрацоўцы новай сістэмы. Гэта ліквідацыі запазычанасцей, раздача метадычак на кафедрах, кансультацыі. Хопіць для пасрэднага выкладчыка (дзіўнае спалучэнне слоў, але, на жаль, яно стала звычайным), хопіць для простага функцыянера. Для Настаўніка, Даследчыка, Вучонага — мала. Будучыня за высокімі прафесіяналамі.

А. ШАСТАК,
студэнтка завочнага аддзялення гістарычнага факультэта.

ЛІХАЯ БЯДА — ПАЧАТАК

# САМ-НАСАМ З КЛАСАМ

*...Раптам з'явілася непераадольнае жаданне сесці дзе-небудзь на «камчатцы» і зноў адчуць сябе вучнем, згодзен нават самым паслухмяным і прыкладным. Абы толькі не стаяць пад шквалам гэтых цікаўных і гарэзлівых дзіцячых позіркаў. Нялёгка пачаць свой першы ў жыцці ўрок, вымавіць яшчэ нязвыклыя словы: «Добры дзень, дзеці!».*

Што і казаць, не такім уяўляўся мне шлях настаўніка. Хай сабе цярністы і складаны, але ж і ўзнёслы, скрозь пасыпаны ружамі. Заўсёды верыў, што змагу яго прайсці, прынамсі, ведаў: і сіл хопіць. І тут ледзь не спатыкнуўся на першым жа кроку. Як жа дайсці да цябе, загадкавая дзіцячая душа, заваяваць давер, адкрыць перад табой таямніцы Краіны ведаў? А вучні глядзяць з надзеяй і шчырасцю, і нельга нікуды адысці, нельга схібіць ні словам, ні поглядам. Трэба забыцца, што ты яшчэ студэнт (хоць за плячыма ўжо цэлыя тры курсы філфака), развітацца з даўняй звычкай акумуліраваць веды. Прыйшоў час аддаваць іх.

Пэўна, у многіх маіх аднакурснікаў, што праходзілі першую сваю педагагічную практыку ў дзевяці школах сталіцы і ПТВ № 55, нечакана з'яўлялася такая разгубленасць, такія думкі. Хлеб настаўніка цяжкі. А калі ты малады настаўнік, то ён цяжэйшы ўдвая. Бо няма ні вопыту, ні дастатковай жыццёвай мудрасці, не можам прымяніць свой багаж тэарэтычных ведаў. На жаль, усё гэта не кампенсуе метадычная літаратура — яе таксама ці няма, ці не хапае. Спадзявацца даводзіцца толькі на ўласныя выдумкі ды на дапамогу вопытных настаўнікаў. У гэтым плане нам вельмі пашанцавала. Побач былі выдатныя педагогі З. Б. Варановіч, В. А. Лашкевіч, В. В. Каладзінскі, В. А. Кузьміч, В. І. Казімірава. Без іх многія з нас, магчыма, і не пераадолелі б псіхалагічны бар'ер закамплексаванасці перад вучнёўскай аўдыторыяй.

Зрэшты, і правесці «эксперыменты» самастойна, без дапамогі кіраўнікоў вельмі цяжка. Дзецям, напрыклад, спадабаліся ўрокі-дыспуты, КВЗ, казкі, экскурсіі. Але мы самі ўпершыню толькі цяпер зразумелі, чаго каштуе арганізацыя такіх урокаў, колькі вопыту ў фантазіі яна патрабуе. Нестандартныя ўрокі вырашылі дапоўніць і нетыповымі пазакласнымі мерапрыемствамі, накшталт сустрэч з тэатрам-студыяй «Летуценнік» на філалагічным факультэце, з паэтам Алегам Лойкам, экскурсій у музеі Янкі Купалы і Якуба Коласа, паходаў па гістарычных мясцінах Пастаўшчыны. Дарэчы, гістарычнае невуцтва дзяцей уразіла нас больш за ўсё. Між іншым, гэтаму садзейнічае і школьная праграма па літаратуры, якая даўно ўжо патрабуе карэнных змен. Часам адчувалася, вучні проста не разумеюць некаторых твораў, не ўспрымаюць народнай мовы. Такая непадрыхтаванасць — адлюстраванне нашага агульнанацыянальнага гора — забыцця роднай мовы.

Аднак надзея на яе адраджэнне ёсць. І цікавасць у дзяцей да сваёй мінуўшчыны вялікая. Выступленні маладых паэтаў-студэнтаў М. Скоблы і У. Бараніча перад вучнямі дванаццаці мінскіх школ праходзілі пры поўным аншлазе. Хочацца верыць, што пасля такіх сустрэч абудзілася нацыянальная свядомасць у многіх маленькіх беларусаў ды і некаторыя настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, відаць, па-іншаму аднясуцца да сваёй справы.

Што ж датычыць студэнтаў, то свой першы ў жыцці экзамен на прафесійную прыгоднасць яны вытрымалі з гонарам. З васьмідзесяці сямі атэставаных практыкантаў семдзесят пяць атрымалі адзнаку «выдатна», дванаццаць — «добра». Выходзіць, не дарэмны быў калісьці выбар прафесіі. І не святыя гаршкі лепяць.

І. КАПЫЛОЎ,
студэнт філалагічнага факультэта.

ЗАВОЧНАЯ ШКОЛА СТЭНАГРАФІІ

# Вышэй і вышэй

Напішам склад ЛІ і дададзім у канцы літару С.



ли лис

Заўважылі? Галосная І падпіхвае знакі ўверх.



вы высь мы мыс тис скис дым легим

Галосная І ў сярэдзіне слова абазначаецца пазіцыйна: зменай пазіцыі наступнай за ёй галоснай. Лінія, якая падняла малыя знакі,— фактычна спалучальная. Але мы пра гэта неяк забываем. Нам бачыцца галосная І, у канцы якой прыпісана зычная.



следим левым пестрым подпись подлегим

Паспрабуем да галоснай прыпісаць іншыя знакі:



ки + г = кг

Замест слова «кит» атрымалася проста «кт». У чым справа? Мы забылі, што І падымае знакі. Малыя знакі мы проста прыпісвалі да галоснай, і яны ўжо аказваліся паднятымі. З аднамернымі знакамі так не атрымліваецца. Іх спецыяльна патрэбна прыпаднімаць, дапамагчы ім крышачку.

Аднамерныя знакі падымаем на паўмеры.



кит пить лить пик тыл выл мил мыл

Каб аснова знака атрымалася на паўмеры вышэй асноўнай лініі, вядзіце злучальную лінію на паўмеры вышэй кантрольнай.

Двухмерныя знакі таксама падымаем на паўмеры. Злучальную лінію пры гэтым патрэбна весці яшчэ вышэй:



гип липы вид подвид

Пакуль мы бралі словы, у якіх падняты знак быў апошнім. А калі за ім будуць яшчэ знакі? На якім узроўні іх пісаць?

Наступныя літары пішам на тым узроўні, на якім аказаўся прыпадняты знак:



видел видеть сидел вилки пилки силки

Але калі за прыпаднятым знакам зноў будзе галосная І, давядзецца, безумоўна, яшчэ раз набіраць вышыню:



сидим пилим дымим висим подпилим

Скарачэнні:



система системы системе литература



литературе дисциплина дисциплине мысль

ПРАКТЫКАВАННЕ:

В системе. В литературе. Дисциплина в классе. К мысли. В смысле. Мы сидим в классе. Плыли киты. Мы видим липы. Висели сети. Следы лисы вели в лес. Мы летим в декабре. Подпилили ель.

Урок вёў Уладзіслаў ГЕРАСІМАЎ

# ДЛЯ ЦЯБЕ

НЕВЕРАГОДНА!

## «СТРАЎНІК ЛЮБІЦЬ РЫТМ, МАДАМ...»

У сярэдневяковай Італіі музыка была адзіным дзейсным сродкам супраць дзіўнай хваробы — так званага «тарэнтызму». Хвароба гэта прыпісвалася ўкусу ядавітага павука тарантула, але хутчэй за ўсё гэта была разнастайнасць псіхічнай эпідэміі. Людзі, калі ўпэўніваліся, што цела іх атручана ядам павука, упадалі ў самоту. Тысячы вандроўных музыкантаў прапаноўвалі паслугі ахвярам тарантула. Пры гуках музыкі хворыя станавіліся жвавымі, расплюшчвалі вочы і пачыналі рухацца ў такт мелодыі. Музыканты ўзмацнялі тэмп, даводзячы хворых да шалёных сутаргавых скокаў — хвароба «вытанцоўвалася», і яд знікаў. У народнай музыцы застаўся з тых часоў хуткі танец — тарантэла.

Эпідэмія скокаў святога Віта (харэаманія) ахапіла ў XIV—XVI стагоддзях мноства гарадоў Германіі, Нідэрландаў, Бельгіі. Натоўпы людзей на вуліцах, плошчах курчыліся, крыўляліся, разбівалі сабе галовы. Гледачы імкнуліся затрымаць танцораў, але заражаліся самі.

Тры музыканты дапамаглі прынцу Аранскаму выратавацца ад зацяжной меланхоліі. Знакаміты спявак Фарынэлі карыстаўся вялікім уплывам пры іспанскім двары толькі таму, што выратаваў караля Філіпа V ад безнадзейнага іпахандрычнага стану. Англійскага філосафа Спенсэра і прэм'ера Гладстана музыка пазбавіла неўралгічных боляў, Байрана — растройства стрававання.

У XVII і асабліва ў XVIII стагоддзі музычнае выкарыстанне было модным у салоннай медыцыне Еўропы. Велікасвецкія эскулапы раілі сваім пацыентам прымаць ежу пад стук барабанаў: «Страўнік любіць рытм, мадам...»

У ЗША створана Нацыянальная асацыяцыя музыкатэрапеўтаў, якія складаюць лячэбныя каталогі музыкі. Яны прапануюць, у прыватнасці.

Для памяншэння раздражнення: Бах, Кантата № 2; Бетховен, «Лунная саната»; Пракоф'еў, Саната ў «рэ»; Франк, Сімфонія рэ-мінор.

Як танізіруючы сродак: Бах, Прэлюдыя і фуга рэ-мінор; Бетховен, уверцюра «Эгмонт»; Чайкоўскі, Шостая сімфонія, 3-я частка; Шапэн, Прэлюдыя Ор. 28, № 1; Ліст, Венгерская рапсодыя № 2.

Супраць рэўнасці і падазронасці: Бах, Кантата № 21; Шапэн, Накцюрн рэ-мінор; Равель, Квартэт у «фа».

Супраць хранічнай злосці: Бах, Італьянскі канцэрт; Гайдн, Сімфонія; Сібеліус, «Фінляндыя».

Супраць галаўнога болю: Бетховен, «Фідэліо»; Моцарт, «Дон Жуан»; Ліст, Венгерская рапсодыя № 1; Хачатуран, «Маскарад».

У час харчавання: Равель, Вальс; Ліст, Канцэрт № 2.

ПАЛЬЧЫКІ АБЛІЖАШ

## «ХВІЛІНКА»

Да вас павінны зайсці сябры, і вы зноў пабеглі ў магазін за тортам. Купіце лепш тры тварожныя сыркі , пачак маргарыну і муку. Спадзяёмся, цукар, сода і воцат у вас ёсць. Вось і ўсе прадукты, якія спатрэбяцца вам, каб парадаваць гасцей цудоўным пячэннем. Шмат часу яно ў вас не зойме.

Маргарын лепш пацерці на буйную тарку, а можна вельмі дробна пасекчы яго нажом. У посуд з маргарынам пакладзіце сыркі і палову чайнай лыжкі соды, якую вы пагасілі воцатам. Цяпер патроху сыпце муку (спачатку не больш шклянкі, затым паступова дабаўляйце яшчэ) і мясіце цеста. Нарэшце вам трэба ўсыпаць столькі мукі, каб цеста добра адставала ад вашых рук і ад посуду. Вымясіце яго старанна!

А цяпер раздзяліце цеста на маленькія кавалачкі (усяго іх атрымаецца 30—40, гэта прыкладна) і з кожнага зрабіце шарык. Складзіце іх разам і пастаўце на гадзіну-другую ў халадзільнік.

Потым бярыце па аднаму шарыку, раскатвайце яго качалкай (або бутэлькай, калі гэта больш зручна для вас), каб атрымліваліся тонкія, амаль празрыстыя, круглыя кавалачкі.



Магчыма, вам трэба будзе пасыпаць дошку, на якой будзеце раскатваць цеста, мукой. Кружок, які ў вас атрымаўся, пасыпце цук - рам, складзіце папалам, потым яшчэ раз папалам і абмакніце зноў жа ў цукар — гэта будзе верх пячэння. Кладзіце яго на ліст. Мазаць ліст нічым не трэба — гатовае пячэнне добра адстае. Пячыце яго не на моцным агні.

Аб смакавых якасцях таго, што ў вас атрымаецца, калі вы ўсё зробіце правільна, мы расказаць не можам — гэта немагчыма апісаць у словах! Паспрабуйце і зразумееце, чаму...

Фота С. ГРЫЦА.



*Як становяцца тытулаванымі прыгажунямі? Другакурсніца філфака Вольга Даніловіч упэўнена, што хацця да конкурсу рыхтуешся, змагаешся з хваляваннем, перамога ўсё ж прыходзіць нечакана. З Ульянаўска Вольга вярнулася дадому ў званні «Студэнцкая зорка-89».*

*Каралева ушанавана, прызы уручаны. Што далей? А наперадзе чарговы гарадскі конкурс прыгажунь. Чаму б не паспрабаваць?*

Фота С. ГРЫЦА.

HOMO SAPIENS

HOMO SAPIENS



## ВАМ І НЕ СНІЛАСЯ

**Няхай тыя, хто адносіцца да сноў з містычным абажаннем, не адчуюць знявагі ў тлумачэнні іх як прадуктаў біяхімічных працэсаў. Няхай не страчваюць нават самыя цвярозыя даследчыкі пачуццё здзіўлення перад гэтымі таямнічымі пасланнямі ночы.**

Сон — «акенца», праз якое можна назіраць працэс пазнання свету чалавекам: малыя бачаць сны-малюнкі, і толькі з часам мозг пачынае склейваць іх у сюжэтныя кінастужкі.

Прадпрымальнікі Станфардскай школы бізнесу ў свой час з'арыентаваліся беспамылкова: з дапамогай кнігі псіхолага Гейла Дэлані «Жыць па сваіх снах» даюць парады па творчаму менеджменту. Яны дапамагаюць вычленіць са сноў азарэнне і выкарыстаць яго ў рашэнні хвалюючых праблем. Гавораць, Эліас Хоу, вынаходнік швейнай машыны, бачыў у сне, што трапіў да дзікуноў, узброеных коп'ямі з дзіркамі ў наканечніках. Прачнуўшыся, Хоу зразумеў, што адтуліну для ніткі больш выгадна зрабіць на канцы іголкі, а не пасярэдзіне. Такія азарэнні здаюцца дарамі багоў, таму што унікальна аб'ядноўваюць адрознівальны вопыт.

Але, калі сумленна, для вучоных сны — не такая ўжо таямніца. Проста набор вобразаў, створаных у час «хуткага» сну — так можна назваць той стан, у якім знаходзіцца чалавек, калі рукі-ногі яго паралізаваны, дыханне нерэгулярнае, а вочы за вейкамі хутка рухаюцца. Добраахвотнікаў у адной з лабараторый будзілі адразу ж пасля імгнення хуткага руху вачэй — і ў 90—95 са ста выпадкаў яны сцвярджалі, што толькі што бачылі сны (дарэчы, такой магчымасці не пазбаўлены і 23-тыднёвы зародак, а таксама птушкі і млекакормячыя).

Сны напаўняюць ночы ўсіх, але запамінае іх не кожны і не заўсёды. І вось што дзіўна: пол таго, хто спіць, указаны беспамылкова. Наогул, сведчыць Мілтан Крэймер, доктар Цэнтра парушэння сну Вялікага Цынцыпаці, у снах амерыканак больш падобнага са снамі жанчын-абарыгенаў, чым са снамі амерыканцаў.

«Сны ў руку»,— гавораць не дарма.

«У людзей, якія бачылі сны аб разбурэннях, расставаннях з сям'ёй, смерці, сардэчныя захворванні былі больш сур'ёзнымі, чым у тых, каго такія сны мінулі». Паколькі пацыенты не ведалі цяжкасці свайго становішча, характар іх сноў наўрад ці вызначала трывога. Верагодна, лічыць доктар Роберт Сміт, сны можна было б выкарыстоўваць, як папярэджваючыя сігналы хваробы.

Псіхіятры распрацавалі тэорыю нараджэння сноў нейронамі ў час «хуткага» сну. Яны нараджаюцца ў ствале мозга, які кантралюе асноўныя з'явы, як рэфлексы. Вядомы два тыпы нейронаў, якія «сочаць» за сном. Кожны з іх выкарыстоўвае розныя хімічныя рэчывы для перадачы сігналаў. Адзін тып выкарыстоўвае ацэтылхалін, другі — нарпінефрын і сератанін. Калі апошнія нейроны адключаны, могуць уключыцца нейроны з ацэтылхалінам. Тады і нараджаецца сон: нейроны з ацэтылхалінам дасылаюць хуткія імпульсы электрычных сігналаў у кару галаўнога мозга, дзе паяўляюцца самыя ўзнёслыя думкі і складаныя вобразы. Кара галаўнога мозга прымае гэтую інфармацыю, ператвараючы яе ў звязную гісторыю.

Магчыма, што ацэтылхалін — менавіта тое рэчыва, без якога не адбудзецца сон (кактэйль сну — гэта $C_7H_{17}N\ O_3$ ці 7 частак вугляроду, 17 — вадароду, 1 — азоту і 3 — кіслароду).

Магчыма, кожны раскрываў «падман», калі ў сне спрабаваў нешта выпіць, з'есці ці ўдыхнуць духмянасць. Да вялікага расчаравання, мы не адчувалі ні смаку, ні паху. Прычыну растлумачваюць фізіёлагі: мяркуючы па ўсяму, у перыяд хуткага руху вачэй энергічна дзейнічаюць нейроны зроку, але не нейроны смаку і абаяння. Хобсан даказвае, што гэта адбываецца таму, што кара атрымлівае сігналы ад мазгавога ствала, а не са знешняга асяроддзя.

Спробы пабудаваць звязнае апавяданне з хаатычных сігналаў ствараюць дзіўныя сюжэты і з'явы, але ў іх ўсё роўна, аднак, ёсць сувязі з рэальным жыццём, таму што мозг «сілкуецца» рэальнымі ўспамінамі для сплятання апавяданняў.

Калі чалавек прачынаецца, каля 95 працэнтаў сноў знікаюць. Хобсан мяркуе, што адбываецца такое таму, што яны адкладваюцца на час у кароткатэрміновай памяці, а хімічныя рэчывы, неабходныя, каб адлюстраваць іх у доўгачасовай памяці,— сератанін і нарпінефрын, адключаны ў час сну.

Вучоныя ламаюць галаву над пытаннем: навошта патрэбны сны? Адшукаць адказ праблематычна — надта складана адрозніць функцыю хуткага руху вачэй ад функцыі саміх сноў. У сне нованароджаных гэты перыяд руху вачэй у два разы даўжэйшы, чым у пяцігадовых дзяцей. Ці не дапамагае сон развіццю мозга?

Па матэрыялах часопіса «НЬЮСУІК».

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
11 студзеня
Зак. 1999.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.